*А.М.Майсяюк, аспірант*

# ВЫКАРЫСТАННЕ БІСЕРУ Ў АЗДАБЛЕННІ ПРАВАСЛАЎНЫХ РЭЧАЎ БЕЛАРУСКІМІ МАЙСТРАМІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ (на прыкладзе творчасці С.З. Семашкевіч)

XX стагоддзе прынясло вялікія выпрабаванні праваслаўным людзям. Першая сусветная вайна, Кастрычніцкая рэвалюцыя, другая сусветная вайна, закрыццё і разбурэнне мноства храмаў – усё гэта не магло станоўча паўплываць на развіццё беларускага іканапісу. Абраз стаў так званай карцінай на рэлігійную тэму. І толькі ў канцы XX ст., дзякуючы з'яўленню іканапісных майстэрань, абраз ізноў становіцца кананічным.

Прынцыпы і мастацкія сродкі стварэння абразоў фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў. Традыцыі іканатворчасці прыйшлі ў Старажытную Русь з Візантыі разам з прыняццем хрысціянства ў канцы X ст. Іканапісны канон ствараўся на працягу доўгага перыяду не толькі іканапісцамі, але і бацькамі царквы. Канон для іканапісца з'яўляецца тым самым, што і богаслужэбны статут для свяшчэннаслужыцеля. (Гл.: Энциклапедия православной иконы. Основы богословия иконы. – СПб.: Сатисъ. 2004. – 335 с.)

Сярод сучасных майстроў, якія вышываюць бісерам, цікавыя самабытныя абразы, створаныя матухнай Свята-Аляксандраўскай царквы Гродзенскай епархіі С.З. Семашкевіч. Больш за 10 гадоў Святлана Зянонаўна Семашкевіч займаецца плённай працай. Дзівосны свет боскасці жыве ў кожнай з мільёнаў пацерак яе ікон. Не выпадкова Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі Філарэт даравяў ей благаслаўленне на творчасць.

Трэба зазначыць, што матухна Святлана вучылася шытву бісерам сама, аднак тэхніка выканання ў значнай ступені падпарадкоўваецца тым прынцыпам вышыўкі бісерам, якія існавалі на працягу стагоддзяў. Так, спачатку бярэцца трафарэт і робяцца асноўныя контуры будучага абраза. Потым атрыманая прастора запаўняецца бісерам і пацеркамі. Бісер ці шклярус нанізваецца на доўгую нітку, пасля выкладаецца па контуры малюнка і прышываецца дробнымі шыўкамі. Такая тэхніка шытва была вядома яшчэ ў XVIII ст. і называецца «шытво ў прыкрэп». Вышываецца ўсё, акрамя аблічча і рук святога. Усе іконы, вышытыя С.З.Семашкевіч, адпавядаюць праваслаўнаму канону.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Майстар дасціпна прытрымліваецца класіфікацыі іканаграфічных тыпаў, якія былі распрацаваны бацькамі царквы, для таго каб кожны мастак вольна арыентаваўся сярод мноства спосабаў адлюстравання святых.

Выявы Хрыста займаюць галоўнае месца як у праваслаўным храме, так і ў хаце верніка. У адпаведнасці з праваслаўным канонам выявы Выратавальніка падзяляюцца на шэсць асноўных іканаграфічных тыпаў: Спас Нерукатворны; Спас Уседзяржыцель (Пантакратар); Спас на прастоле; Спас у сілах; Спас Эмануіл; Спас Добрае Маўчанне.

Ізвод Спас Уседзяржыцель (Пантакратар) можна ўбачыць у кожным праваслаўным храме. Звычайна фрэска або мазаіка «Пантакратар» знаходзіцца ў цэнтральнай купальнай частцы царквы. Аблічча Выратавальніка адлюстроўвае час Хрыста перыяду прапаведніцтва: у яго прамыя гладкія валасы, невялікія вусы і кароткая барада. Правая рука благаслаўляе, левая падтрымлівае зачыненае або расчыненае Евангелле. Характэрнай асаблівасцю гэтага іканаграфічнага тыпу з'яўляецца менавіта выява благаслаўляючай рукі Хрыста і расчыненай або зачыненай кнігі. Кніга, якую Пантакратар трымае ў левай руцэ, можа быць як у выглядзе скрутка, так і ў выгля- дзе кодэкса. Расчыненая кніга абавязкова ўтрымлівае цытату з Святога Пісання. Характар тэксту залежыць ад багаслоўскага зместу, які падкрэслівае кожны іканаграфічны тып. Фігура Выратавальніка адлюстроўваецца ў асноўным па пояс, аднак часта сустракаюцца выявы ў поўны рост, радзей – пагрудныя. На іконе Хрыстос паўстае перад намі ўбраным у гімацій і хітон. (Хітон – адзежа ў выглядзе рубахі. На правым плячы хітона адлюстроўваецца клавій – нашытая вертыкальная паласа – сімвал чысціні і дасканаласці. Гімацій – прамавугольны адрэз тканіны, які выкарыстоўваўся ў якасці верхняй адзежы.) Вакол галовы Выратавальніка німб з крыжом пасярэдзіне. Праз малюнак німба мы вызнаем у Хрысце Боскае і людскае.

На іконе С.З.Семашкевіч «Спас Уседзяржыцель» можна заўважыць, што выява Хрыста поўнасцю адпавядае іканаграфічнаму ізводу Пантакратар: фігура Выратавальніка адлюстравана па пояс, правая рука яго благаслаўляе, у левай – адчыненае Евангелле. Абраз напісаны алеем, а адзенне вышыта бісерам, шклярусам, пацеркамі і стразамі. Што тычыцца каляровага выканання, то заўважаем адхіленні ад праваслаўнай сімволікі колеру: традыцыйна хітон Выратавальніка мае адценні чырвонага

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

колеру, а гімацій – сіняга. Спалучэнне гэтых двух колераў сімвалізуе зямную (чалавечую) і нябесную (боскую) прыроду Выратавальніка. Чырвоны колер – гэта і сімвал пакутніцтва, паколькі ён нагадвае колер крыві, і сімвал царскай улады. Сіні колер сімвалізуе сферы нябесныя, гэта колер чысціні і бязгрэшнасці. У спалучэнні двух колераў прысутнічае таямніца спалучэння двух розных светаў – чалавечага і боскага. Аднак на іконе хітон – серабрысты, а гімацій – белы. Белы колер у праваслаўнай іканаграфіі – колер чысціні, святасці і прастаты. Дамінуючымі з’яўляюцца наступныя колеры: залацісты, серабрысты, чырвоны, белы, блакітны, што ўвогуле адпавядае праваслаўнай сімволіцы колеру.

У іканаграфіі Багародзіцы вылучаюцца тры асноўныя тыпы: «Багародзіца, якая моліцца», «Пуцевадзіцельніца», «Замілаванне».

«Пуцевадзіцельніца» (Адыгітрыя) – гэта ікона, на якой Багародзіца адлюстроўваецца разам з Хрыстом-дзіцем, якога яна трымае на левай руцэ. Правай рукой Багародзіца паказвае на Хрыста: як бы гаворыць усяму людскому роду, што са- праўдны шлях – гэта шлях да Хрыста. На такіх іконах Багародзіца паўстае пуцевадзіцельніцай да Бога і вечнага выратавання. З ікон гэтага тыпу найбольш вядомыя Смаленская і Казанская. Да іканаграфічнага тыпу «Пуцевадзіцельніца» адносяцца выкананыя С.З.Семашкевіч абразы, прысвечаныя Казанскай іконе Багародзіцы. Абразы вышытыя бісерам, пацеркамі разнастайных колераў і адценняў, акрамя таго, майстар выкарыстала вялікую колькасць стразаў. Дамінуючымі з’яўляюцца чырвоны, ружовы і барвовы колеры мафорыя, белы і залацісты колеры фону і німбаў, а таксама блакітны колер споднял адзежы Багародзіцы. Сподняе адзенне звычайна пішуць блакітнымі фарбамі (знак нябеснай чысціні).

«Замілаванне» – рускі варыянт перакладу грэчаскага слова «елеўса», што ў дакладным перакладзе значыць «літасцівая». Гэты тып іканаграфіі склаўся ў Візантыі ў ХІ ст. на аснове іканаграфічнага тыпу «Адыгітрыя». Выявы тыпу «Замілаванне», як правіла, паясныя. Дэталёва разгледзець іканаграфію «Замілавання» можна на прыкладзе абраза Багародзіцы Уладзімірскай. На іконе Багародзіца апранута ў мафорый (вялікі чатырохвугольны плат, які ахутвае галаву і ўсю фігуру) цёмна-чырвоных адценняў, па ўскрайках аздоблены аблямоўкай і бахрамой. Зоркі на мафорыі маюць два значэнні: па-першае – сімвал бязгрэшнасці і цнатлівасці, а па-другое – сімвал Святой Тройцы. Німб вакол галовы

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Багародзіцы ў адрозненне ад німба Хрыстоса-дзіцяці не мае крыжа. На іконах Багародзіцы абавязкова прысутнічае скарочанае напісанне слоў «Маці Бога». Гэта грэчаскія літары МР ΘV.

Да іканаграфічнага тыпу «Замілаванне» адносяцца наступныя выкананыя С. З. Семашкевіч абразы: «Замілаванне», «Пачаеўская ікона Багародзіцы», «Жыровіцкая ікона Багародзіцы». На іконе «Замілаванне» адзенне Багародзіцы вышыта бісерам і пацеркамі белага і залацістага колераў (мафорый белага колеру, а туніка – залацістага), што дазваляе адчуць веліч і ззянне нябеснага царства. Сіні колер фону азначае бяскрайнасць неба і лічыцца ўвогуле колерам Багародзіцы. «Пачаеўская ікона Багародзіцы» і «Жыровіцкая ікона Багародзіцы» выкананы ў поўнай адпаведнасці з праваслаўным канонам: тон мафорыя Багародзіцы цёмна-чырвонага адцення, па краях мафорый аздоблены аблямоўкай і бахрамой у выглядзе вялікіх белых пацерак. Німб вышыты бісерам залацістага і жоўтага колераў. Сподняе адзенне вышыта блакітным бісерам. На іконах прысутнічаюць грэчаскія літары МР ΘV.

Вядома, усё накладвае адбітак на характар абраза, яго колеравы лад. Аднак рэгіянальныя асаблівасці ніколі не павінны выходзіць за межы праваслаўнага канона. Такім чынам, ствараючы культавую рэч, майстар заўсёды абавязаны прытрымлівацца кананічных правіл. Роля каляровай сімволікі, адзін з самых дзейсных элементаў кананічнага абраза. Кожны колер у суадносінах з рознымі формамі, знакамі і сюжэтным зместам малюнкаў атрымлівае розныя сэнсавыя адценні і не можа быць адназначным. Адмаўленне ад іканапіснага канона можа прывесці да памылак, якія маюць непасрэднае ўздзеянне на духоўнае жыццё чалавека. Кананічныя традыцыі ўласцівыя і работам С.З.Семашкевіч, якая ў іх скарыстоўвае тэхналагічныя прыёмы папярэдніх эпох: напісанне алеем ліка і рук святога; шытво адзежы святога рознымі матэрыяламі: бісерам, шклярусам, пацеркамі differentнага памеру, стразамі; дасціпная тэхніка выканання з выкарыстаннем бісеру і шклярусу разнастайных колераў і адценняў, святлоценявая мадэліроўка адзежы, запаўненне ўсяго фону нізкамі караляў, выкарыстанне буйных круглых рознакаляровых пацерак і стразаў у якасці дадатковай аздобы.

Усе іконы, дэкараваныя бісерам, падпарадкоўваюцца праваслаўнай сімволіцы колеру і адпавядаюць традыцыйным праваслаўным ізводам. Тым не менш, калі толькі давядзецца пабачыць іх аднойчы, то потым заўсёды пазнаеш гэтыя іконы сярод мноства іншых, створаных другімі мастакамі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ